УДК 821.161.3.09

**М. С. Богуш**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# НАМІНАЦЫЯ «НІ ГОСЦЬ НІ ГАСПАДАР» ЯК ПАКАЗЧЫК «НОВАГА ГЕРОЯ» Ў АПОВЕСЦІ ЛУКАША КАЛЮГІ

**Уводзіны**. Лукаш Калюга належыць да тых пісьменнікаў, якія не толькі сцвярджалі каштоўнасці традыцыйнай народнай маралі, але і настойліва імкнуліся разабрацца ў сутнасці новага грамадства, а таксама ў маральных і ідэалагічных дэфармацыях, якія з ім адбываліся. З найбольшай паўнатой роздум і трывога Л. Калюгі ўвасобіліся ў аповесці «Ні госць ні гаспадар» — вялікім эпічным творы, на жаль, незавершаным. Гэта не магло не паўплываць на паўнату ўвасаблення аўтарскай канцэпцыі і яе сучаснага разумення [1; 2, с. 24]. Твор меў вялікі поспех, што ў пэўнай меры звязана з яго аўтабіяграфічнасцю: Л. Калюга, як і галоўны герой аповесці Хвядос Чвардоўскі, пасля заканчэння сямігодкі нейкі час жыў у роднай вёсцы, дапамагаў дзядзьку па гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй, разам з камсамольцамі бавіў час на сходах і ў спрэчках. Але аўтар выявіў майстэрства і ў філасофскім асэнсаванні працэсаў, якія адбываліся ў змененым грамадстве [3, с. 46].

**Асноўная частка**. У аповесці «Ні госць ні гаспадар» адлюстраваны той час, калі яшчэ не вялася калектывізацыя ў яе жорсткіх формах. Падзеі Вялікага пералому пісьменнік увасобіць пазней, у творах «з-за крат». Пакуль жа вёска малюецца традыцыйна, аднак і ў гэтым спакойным жыцці Л. Калюга здолеў разгледзець і паказаць вельмі істотныя для развіцця нашага грамадства працэсы і тэндэнцыі, выявіўшы неардынарную прадбачлівасць. За аўтарскім абагульненнем «ні госць ні гаспадар» бачыцца адна з найбольш цяжкапераадольных і задаўнелых грамадскіх хвароб. Пачынаючы з 1920-х гадоў, чалавек адлучаўся ад усяго, што павінна было яго прывязваць да жыцця, надаваць сэнс зямному існаванню, абуджаць пачуццё адказнасці за матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Гэта пазней прывяло да крызісных з'яў у экалогіі, нацыянальнай культуры, маралі. Заслуга Л. Калюгі ў тым, што ён заўважыў гэтую небяспеку тады, калі мала хто пра яе здагадваўся.

Важна адзначыць, што праблема «ні госця ні гаспадара» ў святле тагачаснага літаратурнага працэсу была своеасаблівым, хоць, магчыма, і недастаткова ўсвядомленым адказам маладога празаіка на актуальную тэндэнцыю пошукаў «новага» чалавека, station ўчага ідэалу савецкай літаратуры. Камсамольцы, моладзь нясуць у вёску друкаванае беларускае слова, арганізуюць «хаты-чытальні», ладзяць спектаклі, стараюцца выкараніць старыя «хваробы» — карты, самагонку. Аднак ідэі новага грамадства яны гатовы прызнаваць нечым больш вартым і патрэбным, чым нялёгкая праца на зямлі. На гэтым грунце немінуча вынікае іх канфлікт з уласнымі бацькамі — старымі «гаспадарамі», — які часам набывае хваравітыя формы. Гэта яшчэ больш узмацняе самаадчуванне «ні гасцей ні гаспадароў». Так пачынае фарміравацца ўсведамленне вышэйшасці моладзі перад бацькамі, перавага абстрактных ідэй над тым, чым сапраўды трымаецца жыццё на зямлі. А гэта, у сваю чаргу, не можа не ўплываць на маральны стан недаростка, які пачынае адчуваць і дэманстраваць сваю перавагу над іншымі. Гэтая вельмі важная для новага грамадства праблема ўвасабляецца ў вобразе Бладзіка Мотуза. Ён не мае ні прыроджанай, ні набытай праз кнігу культуры, але яго няўрымсліва-бунтоўны характар найбольш «прыстасаваны» да засваення ўсяго новага, незвычайнага, што з вялікага свету даходзіць у глухі беларускі куток праз друкаванае слова і вусныя выступленні заезджых таварышаў. Бладзік досыць непрадказальны і нечаканы ў сваіх паводзінах і ўчынках. Дзейнасць падобных актывістаў прыносіць мала карысці. Нават такая дробязная справа, як папраўка маста, і то не рухаецца з месца, бо аб ёй толькі спрачаюцца да ночы на сходах. Куды больш, чым канкрэтныя справы, цэніцца ўменне прыгожа, складна гаварыць. Калюга паказвае, што маладыя хлопцы часта ўступалі ў камсамол з жадання быць сучаснымі, неяк вылучыцца, а не па цвёрдых ідэйных перакананнях. Яны не ведаюць шляху, якім ісці, і па-свойму, наколькі дазваляе культура, выконваюць указанні райкома, таму аўтарская думка прачытваецца даволі празрыста: яны пакуль што больш госці, а не гаспадары на роднай зямлі.

Намінацыя «ні госць ні гаспадар» пазначае і іншага героя, распаўсюджанага ў творах Л. Калюгі. Гэта выхадзец з сялянства ў інтэлігенцыю, які вяртаецца — хоць і не заўсёды па ўласным жаданні — назад у сяло, але поўны намеру служыць яму. Пры гэтым ён адчувае своеасаблівае раздваенне, аб якім і гаворыць дадзеная намінацыя. Такі герой у аповесці «Нядоля Заблоцкіх» — Савоста, у аповесці «Ні госць ні гаспадар» — выпускнік сямігодкі Хвядос Чвардоўскі. Яму даводзіцца застацца ў роднай вёсцы, бо ён адзіны сын і, акрамя яго, бацькам няма ад каго чакаць дапамогі. Але не менш важна і тое, што мілы яму «родны кут — бацькава хата» [4, с. 142]. Да таго ж прымешваецца яшчэ і голас свядомага грамадзяніна: «А хто зямлю капаць будзе? Хто без вас застанецца хлеб рабіць?» — спрачаецца ён у думках з сябрам [4, с. 160]. Ігналя, бацька Хвядоса, агітуе хлопца ўсё кінуць, апроч працы на зямлі, бо «няма лепшага панства, як гаспадарства», паказвае сыну «розныя таямніцы хараства і спрытнасці ў гаспадаркім жыцці» [4, с. 173]. Сын слухае, разумеючы, як шмат сіл, энергіі, самаахвярнасці патрабуе

© Богуш М. С., 2018



Репозиторий БарГУ

праца на зямлі, бо «пра адно толькі маўчыць» бацька: «маўчыць, што па фунту соды ідзе ў тыдзень на яго сарваны жывот, што да сто разоў нанач з боку на бок пераварочваецца, косці баляць у гэтакі веку — усяго сорак год» [4, с. 174]. Непакоіцца Хвядос, што гэтая праца «ўвесь час глыне, нельга будзе кніжку ў рукі ўзяць, газету час ад часу прагледзець», маладыя гады яго марна загінуць, нічога ён не будзе ведаць на свеце. Гэтыя шчырыя роздумы героя на адзіноце з самім сабой вельмі важныя для разумення сапраўдных памкненняў і жаданняў Хвядоса. Герой дзейнічае ў новым часе і ў новых абставінах, далучаецца да камсамольцаў Хатніцкай ячэйкі. Не так зямля, як кніга вабіць яго; ён ахвотна ўдзельнічае ў пасяджэннях, сходах, спектаклях, дзе выяўляюцца яго акцёрскія здольнасці. Хвядосу яшчэ належыць прыняць канчатковае рашэнне — быць гаспадаром або госцем на роднай зямлі. Палавінчатасць, мітусня паміж земляробчай працай і самаадукацыяй непазбежна спараджаюць унутраны канфлікт з самім сабой, што пранікнёна ўбачыў пісьменнік, хоць і не вельмі засяродзіў на ім увагу. Ды і знешне ён, гэты канфлікт, ужо пачынае праяўляцца, бо бацька не-не ды і зазлуе на сына, што той цягнецца ў бібліятэку ці на рэпетыцыю, марнуе рабочы час. Пры бацьку юнак так і застаецца памагатым — «ні госць ні гаспадар»… І ўсё ж у канцэпцыі гэтага героя адчуваецца гаспадарская неабыякавасць да таго, што робіцца ў вёсцы, што нясе новы час.

**Заключэнне**. Лукаш Калюга ўвайшоў у айчынную літаратуру як стваральнік шэрагу трапных, нацыянальна адметных намінацый, у якіх адбіваецца вядучая ідэя асобы. Адна з іх — «ні госць ні гаспадар», якая дала назву аповесці таленавітага празаіка. Калюга адным з першых напісаў значны твор пра маральна-духоўнае аблічча моладзі 1920-х гадоў, першых камсамольцаў, які, на жаль, застаўся незавершаным. Намінацыю «ні госць ні гаспадар» варта разглядаць не толькі як своеасаблівую метафару-характарыстыку становішча тагачаснай вясковай моладзі, якая адрываецца ад зямлі і спрадвечных народных каштоўнасцей. Гэта і адзнака самаадчування інтэлігента, які выйшаў з сялян, і мастацкі паказчык аўтарскага пошуку «новага» героя.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускае літаратуры / А. Адамовіч. — Мінск : Выдавец IП Зьміцер Колас, 2005. — 1464 с.
2. Вяртання маўклівая споведзь: Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. — Мінск : Выш. шк., 1994. — 318 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск : Беларус. навука, 1999. — Т. 2. — 903 с.
4. *Калюга, Л.* Творы : раман, аповесці, апавяданні, лісты / Л. Калюга ; уклад., прадм. Я. Лецкі ; камент. Н. В. Гаўрош, Т. М. Трыпуцінай. — Мінск : Маст. літ., 1992. — 607 с.


УДК 811.161.3:82-31

**Т. Р. Бруцкая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ЛЕКСІЧНЫЯ ПАЎТОРЫ Ў РАМАНЕ НІЛА ГІЛЕВІЧА «РОДНЫЯ ДЗЕЦІ»

**Уводзіны.** Раман у вершах Ніла Гілевіча «Родныя дзеці» — твор, насычаны living рознымі лексічнымі і вобразна-выяўленчымі сродкамі. Таму мова рамана вызначаецца жывасцю і непасрэднасцю. Вялікую ролю ў гэтым адыгрываюць лексічныя паўторы, сярод якіх вылучаюцца анафара, эпіфара, энімона, анадыплосіс, дыяфара, кальцо, стык, паліптот і іншыя стылістычныя фігуры.

Паўтараючыся, слова набывае розныя канатацыйныя прырашчэнні. Лексічны паўтор сэнсава і эмацыянальна ўзмацняе выказванне, надае яму экспрэсіўнасць. Акцэнтуючы ўвагу чытача на пэўным слове, лексічныя паўторы надаюць мове твора адценне то спакойнай разважлівасці, лагоднасці, то ўсхваляванасці, то ўрачыстай узнёсласці. Інакш кажучы, лексічныя паўторы з'яўляюцца дзейсным сродкам выяўлення ўнутранага свету герояў рамана, іх эмацыянальнага стану, настрою.

**Асноўная частка.** Як і ў лірычных творах Янкі Купалы, у рамане Н. Гілевіча «Родныя дзеці» «паўтораныя лексемы размяшчаюцца кантактна і дыстантна, анафарычна і эпіфарычна, у адной страфе і на працягу ўсяго тэксту твора» [2, с. 200]: *Як азірнуўся — на паўнеба / Сцяной* ***нясецца*** *буры дым. / «Пажар! — кальнула зразу ў сэрца. — / Лясы? Ці хаты? Штось гарыць!..» / І — зразумеў: не дым* ***нясецца*** *— / Тарфяны пыл сцяной* ***ляціць****! / Да неба сёмага вятрыска /* ***Зямлю*** *уздыбіў над* ***зямлёй****. /* ***Зямля ляціць*** *у небе пылам, /* ***Ляціць****, імчыцца ўдалячынь* [1, с. 68]; ***Чарней****,* ***чарней****,* ***сястра-дуброва****, /* ***Чарнець*** *з табой нам удваіх: / Ты па сваім* ***лісці****,* ***дуброва****, / А я — па* ***лецейках*** *сваіх. / Тваё* ***лісцё****,* ***сястра-дуброва****, / Зноў забуяе па вясне, / А мае* ***лецейкі****,* ***дуброва****, / Ужо не вернуцца ка мне...* [1, с. 129] і інш.

Часта ў тэксце рамана выкарыстоўваюцца **кантактныя паўторы**, якія надаюць мове выразнасць і эмацыянальнасць, маўленню — асаблівую экспрэсію, узвышаюць тон, запавольваюць тэмп выказвання, робяць яго велічна-спакойным: *А дыхту* ***болей****,* ***болей*** *хоча / Не толькі цела, а й душа* [1, с. 7]; *Ды і не проста*

© Бруцкая Т. Р., 2018



Репозиторий БарГУ